УДК 82.09 (476)

# МІФАЛОГІЯ Ў НОВАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ
# СПРОБА КУЛЬТУРАЛАГІЧНАГА АНАЛІЗУ ВЕРШАЎ А. ХАДАНОВІЧА

*канд. філал. навук, дац. Н.Б. ЛЫСОВА*
*(Полацкі дзяржаўны універсітэт)*

*Аналізуюцца адносіны сучаснага айчыннага лідэра постмадэрнісцкай паэзіі А. Хадановіча да міфалагічных вобразаў. Вызначаецца традыцыйнасць паэтычнага бачання тэм творчасці, Радзімы, кахання.*

Выкарыстанне міфалогіі ў якасці мастацкіх сімвалаў, знакаў пачалося яшчэ ў антычнасці (у так званы постфесалійскі перыяд) і з пераменнымІ выбухамі здарапася на працягу гісторыі літаратуры, у тым ліку і беларускай. Вядома, што на пачатку беларускай літаратуры існуюць ананімныя паэмы, дзе аўтары ствараюць бурлескны варыянт класічных міфалагічных вобразаў, «нізкую» сучаснасць XIX стагоддзя асэнсоўваюць пры дапамозе «высокіх» вобразаў алімпійскіх багоў.

Адзін з лідэраў сучаснай новай (постмадэрнісцкай) паэзіі Беларусі Андрэй Хадановіч падкрэслівае, што беларуская паэзія пачалася з «перакуленага з ног на галаву ВэргІлія й «Тараса на Парнасе» [1, с. 37]. І асабіста працягвае гэты прынцып творчасці. Таму менавіта ён і стаў героем аналізу сённяшняга стаўлення да міфалогіі Новага Паэта.

На нашу думку, выкарыстанне міфалогіі сёння мае дзве тэндэнцыі: як светаўспрыманне (насуперак атэістычнаму - рэлІгійнае ці язычніцкае, напрыклад паэзія Анатоля Сыса) і як гульня з міфалагічнымі вобразамі, прыстасаванне іх да сучасных культурных ідэалагем ці літаратурных вобразаў, ці масавых стэрэатыпаў... Такая ін’екцыя сучаснасці мастацка-вобразнага вопыта мінулага можа мець назву амерыканскай тэндэнцыі. Апошняя набыла ў культурным працэсе пашыраны характер, але мае «сур’ёзныя» намеры - стварэнне масавай квазіміфалогіі гісторыі і сучаснасці. Айчьшны зварот да мІфалагІчных вобразаў адбываецца актыўна ў межах постмадэрнісцкага топасу, дзе мае іранічнае паходжанне.

Першы лавярхоўны погляд на паэзію Хадановіча, з гэтага пункту гледжання, стварае выяву хрэстаматыйнага Хлестакова, што цытуе шмат знаёмых назваў, імёнаў, каб выратаваць сваю «задніцу» ад «гараднічага асяродку», у нашьш выпадку, каб уратаваць сваю творчую самасць ад «неўважлівых» чытачоў і пісьменніцкага «засілля». Ды і сам Хадановіч прызнаецца: «Сваёй задачаю лічу разбурэньне стэрэатыпаў» [2, с. 189].

З чым згаджаецца і крытыка. Як мэту прынятай Ім паэтыкі калажнасці, цытатнасцІ і «маўпавання» яна вызначае наступнае: «Гаворка пра эскапізм і самаабарону» [3, с, 71].

Але пры больш уважлівым знаёмстве з лірыкай А. Хадановіча заўважаеш, што міфалогія мае акрэсленую тэматычную прастору выкарыстання на чале з праблемай творчасці, мастацкага прызначэння. Паэт піша асабістую (калі размова ідзе аб Творцы) міфалогію:

«Толькі дух мяне трымае ўверсе,
магутны дух, непераможны дух!
Пакуль жывём над месяцам І сонцам,
я ўсім вам буду ксёндз, імам, равін
(ці, можа, рабін?) - усё раўно ўлюбёнцам!...
*Я* ўжо не чалавек - сучасны міт!» [4, с. 42].

Так, напісаны ім міф Іранічны, паэт збірае да купы ўсе магчымыя канфесійныя іпастасі «ГТаэтабога», і можа, гакім чынам сур’ёзна разбурае сацыяльныя, народныя спадзяванні на «месіянства» творцаў, адмаўляецца ад сацыяльнай ролі літаратара.

Але ж сам зварот да праграмнага тэматычнага сюжэта выводзіць новага аўтара ў кола міфалагічнай залежнасці. Тэта сюжэт паэтычнага «ПомнІка». ПомнІк Гарацыя - апафеоз Рыму, помнік Нушкіна - апафеоз вольнасці і народнасці творчасці, помнік Бродскага - зацверджанне ўпартага Індывідуалізму, помнік Хадановіча: «Я помнІк ладжу ў кшталце манускрыпта...» [5, с. 42]. Усе паэтычныя «помнікі» - гэта размова з наступным пакаленнем, з Часам, гісторыяй, з БагамІ, якІя кіруюць светам. Накшталт адказу на пытанне: навошта боскае з’яўленне Паэта ў гэты Час у свеце: каб апяваць рымскі парадак, каб клікаць да лепшага парадку, каб упарта адстойваць маральныя вартасці або каб... пісаць новы паэтычны «манускрыпт». Здаецца, адказ ХадановІча - занадта простая, нятворчая, задача. Але ў размове аб наканаванасці творчасцІ Хадановіч абірае І патрыятычны, няхай і іранічны, адказ:

«Ніхто з палякаў, рускіх альбо немцаў
майго імя ніколІ не кране.
Мяне чакае ўдзячнасць спадкаемцаў.
Вас - вечныя ўспаміны пра мяне!» [6, с. 42].

Тэта і прызнанне самадастатковасці Новага Паэта, яго прасторавай і часовай незалежнасцI.

Класічная міфалогія дае шмат варыянтаў атаясамлявання творцы з боскім вобразам: Дедал, Ікар, Апалон, Арфей.... Выбар якіх у гIсторыі культуры стаў сваеасаблівым акцэнтам працэсу ці выбарам часовай спецыфікI мастацтва, стрыжнем гістарычнага мастацкага стылю. З XIX стагоддзя, пры дапамозе Ніцшэ, паэтычная «паства» вагаецца паміж Апалонам і Дыянісіем; далей сімвалісты спачатку дадалі да гэтага раду Праметэя, а потым мадэрністы ажывілі вобраз Арфея.

Напрыканцы XX стагоддзя, вызначаючы постмадэрнісцкI напрамак паэтычнага мыслення, выбар Хадановіча ідзе вакол такіх вобразаў, як Геній, Апалон, Заратустра. «Я таксама на першага траўня ўспамінаю пра ўласны гонар» - піша паэт у вершы «Ноч салідарнасці» [7, с. 40]. Тэта ВАРПУРПЕВА НОЧ, НОЧ НА ЛЫСАЙ ТАРЫ, ШАБАШ ВЕДЗЬМАЎ - такі паэтычны вобразны рад вызначанай паэтам савецкай (пад «зоркамі Сярпа і Молата») і постсавецкай прасторы, дзе жыве народ Каіна ў чаканні новага Завету ці, як іранічна ўдакладняе паэт, «хэпіэнду». Тэта - містэрыяльная прастора яго Паэта існавання. Адсюль паэты чнае яднанне вар'яцтва і масгацкіх пошукаў. Таму мастацкі вынік для нашага аўтара ўсё часцей ~ выпадковы і недакладны, творчасць - «вар'яцтва - амаль на траціну» [8, с. 42], «вар'яцтва як мастацкае прыймо» [9, с. 39].

Аўтар мастацкага твору неакрэслены - ён у полілогу з героямі, чытачамі, з самім сабою, з часам. Нездарма паэзія Хадановіча набыла трапнае крытычнае вызначэнне - як «ліставаньне з клясыкамі» [5, с. 73]. А творчая атмасфера - часцей атмасфера сну, трызнення наяве ці «амНЕзія - амністыя начным і дзённым вязням духу» [4, с. 39].

Здаецца, з аднаго боку, паэт імкнецца да дыянісійскага творчага ідэапу, які лічыўся літаратарамі-сімвалістамі вышэйшым містычным ці прароцкім вобразам. Здзейсна, паэт-ты новы міф! Але з другога боку, сучасны творца - «руплівец культуры», паслядоўнік Апалона-Мусагета, якога чакае лёс Ікара: аб гэтьш у такім вызначэнні яго - «вязень слова, кемлівы штукар,/апалонік, малады Ікар» [4, с, 39].

«Руплівец культуры» - іранIчны верш (можа, самаIранічны): верш пра паэтавы пакуты (пакуты творчасці), пра несупадзенне вышынь паэтычных думак і нізкай рэальнасці. Так, у сучаснага аўтара няма даверу сацыяльным рашэнням праблем чалавецтва, ён быццам назначаны на ролю народнага правадыра, але добра ведае аб выніках тых паэтаў, што абралі формулай творчасці - «паэтам можаш ты ня быць, а грамадзянінам абавязаны».

Настойліва паўтарае Хадановіч такое міфалагIчнае вызначэнне творцы як геній, што «у адказнасьці за ўсё!» [6, с. 141]. Аўтар іранічна малюе вобраз Генія-дэмана (менавіта так яшчэ ў грэкаў, а потым ў дэманалогіі) (7,145), калI стварае паэтычную алюзію на пушкінскую формулу «геній I злачынства» ў «Санеце», дзе абыгрывае казачную формулу «агонь, вада і духавая медзь» і сцвярджае сваё пазтычнае крэда адзінствам «розума і вар'яцтва» [4, с, 39].

Пра аднаго з сучасных лідэраў новай паэзй (Мінскевіча) сам Хадановіч гаворыць як аб геній-духу; «Глядзіце, гэта ён, помнік і чалавек, вечны юнак беларускай паэзї, genius loci роднага гораду, хадзячы доказ пераемнасьці культуры, бяздомны паэта, о крый яго, Божа!» [8, с. 66]. Паэт як дух гораду, а можа і ўсяго беларускага народа (купалаўскія радкі прымушаюць думаць гэтак). Канешне, іранічна зніжаны міфалагічны вобраз, бо genius loci абарочваецца ў творчасці Хадановіча «геніюсам у лодцы». Пад такой назвай ён піша цыкл вершаў, які можна было б абазначыць, як вершы аб творчым натхненні, ці паэтычным адчуванні сонца, дажджу і слова. Двухсэнсоўны іранічны вобраз паэта-генія ствараецца самім горадам, народам («які прыход - такі і поп»),

Але ў вершы «Сэанс самаўнушэньня» чытаем:

«можна гарлаць партызанскія песьні
кідаць сызыфа ў чужы агарод
можна падохнуць у брудзе і плесьні
нельга абразамі ганіць народ» [9, с, 47].

У другім вершы без назвы (але з эпітэтам з ясенінскага «Не жалею, не зову, не плачу» і з земфіраўскага цI зэкаўскага «ня вер, ня бойся, не прасі»), што пачынаецца словамі «апракуты ў рымскую тогу» [9, с. 47], паэт ганарліва судзіць і тлумачыць сучаснасць - I «плюе», і «палохае», і «шкадуе», і «клікае». Яго міфічная прастора - Айчына Беларусь, што вырастав кшалт дэмаралізаванага інтэрнацыянальнага Рыму,

«бо ты тут істота чужая
стаіш на шляху балазе
на дурняў народ не зважае
і нсяк паўз вас папаўзе» [9, с. 48].

Паэт I Час, паэт і РадзIма, прызнанне сваёй асацыяльнасці абарочваецца прызнаннем адзінства свайго лёсу і Беларусі «Бо сёньня літаратура ў нас працягвае выконваць функцыі захаваньня самой мовы, нарэшце, яна яўна ці прыхавана супрацьстаіць сёньняшняму рэжыму» - гаворыць сам Хадановіч

аб беларускай паэзіі [8, с. 63]. Такім чынам, рымская тога ці ганарлівы паэтавы позірк на сучаснасць з античных катурнаў з'яўляецца знакам беларускага паэта, што выконвае пачэсную ролю захавання духоўнасці. Аўтар набліжаецца да вобразу «генію рымскага народу», мо таму Уладзіміру Арлову паэт Хадановіч бачыцца менавіта ў рымскай тозе:

«Мне прысніўся Хадановіч:
Велічны, нібы сэнатар,
Недарэзаны Нэронам,
Іранічны, як Свэтоні,
Заклапочаны, як Брут» [10, с. 60],

а адсюль ужо паўкрока да працягу такой сацыяльнай квазіміфалогіі, як «Чацвёрты Рым», да якой штурхае патрыятычная тэма творчасці ХадановІча, што гучыць пастаянна, Напрыклад, замежны цыкл «Неба над Берлінам» (дарэчы, асацыяцыя таксама дасылае нас да размовы Творцы з боскімі анёламі, на тэты раз - да нямецкага кінавобразу) заканчваецца ўспамінам з дзяцінства і супастаўленнем чачэрскіх «няліпавых» шчаслівых хвілін цывілізаванаму гарадскаму шыкоўнаму краявіду на берлінскай «Unter den Linden».

Куды плыве гэты Геній? На Захад ці на Усход? Да жыцця і ці да агоніі? Геній - Апалон - Ікар - Заратустра -- ...«руплівец культуры», «улюбёнец», «кукалка, каўшанка, хрызаліда, лялечны зародак вышынІ», «выратавальнік наш прыйдучы», «самотны русаіст», «паліглот-моважэрца», «тлумач», гамункулус.., Такія жорсткія і вобразныя самахарактарыстыкі гучаць з паэтавых вуснаў.

За іранічным поглядам Хадановіча на вобраз Творцы праглядае зусім невясёлая споведзь аб сучасным паэце. Новы паэт - суддзя і сабе, І народу, і часу, КалІ «Бог памёр», выходзіць Паэт - ён бачыць, ён судзіць, Нездарма, Хадановіч арыентуецца на Заратустру («Дэкадэнта папхні, як вучыў Заратустра...» [4, с. 42]. 1 ў яго самым жорсткім вершы «Бога Бабулькі» гучыць страшны прысуд рэальнасці: «ты дай мне, баба, веры, - /Заўжды жадала стрэліць, - ды зачыняла дзьверы...» [6, с. 142].

Новы Паэт спадзяецца на Дух, валодае Словам І гаворышь аб творчасці, жанчыне і музыцы. Так можна тэматычна акрэсліць паэтычныя варункі Хадановіча. Але яны ствараюць і своеасаблівую формулу - логіку існавання «новага міфа»: вар'яцтва + розум + ...каханне. Старая новая формула, яна адсылае нас да Платона, і не суліць паэту нічога добрага. Па словах самога Хадановіча, «Платон мне камарад, ды ісціна ў глытку тваёй цыкуты» [11, с. 55].

Вядома і міфалагічнае вызначэнне эстэтычнага Платонам праз сповед аб нараджэнні Эроту, які, здаецца, натуральна працягнуты міфалагічнай вобразнасцю паэзіі ХадановІча. Аўтар - у чаканні Эроту. Адчувае яго адсутнасць у сваёй творчасці: «У маіх тэкетах выразны ўхІл у бок рацыянальнага, а не эмацыйнага. У мяне амаль няма млоснай лірыкі, ня.ча відавочнай еентыментальнасьці, разлічанай на чульлівага, спагадлівага чытача ...я па-добраму зайздрошчу аўгарам, здольным расчуліць сваіх чытачоў (чытачак!), выклікаць у іх сьлёзы» *[2,* с. 192],

І зноў жа паэт кідаецца на дапамогу ў краіну міфалагічных І літаратурных знакавых вобразаў. Таму такім важным вобразам з'яўляецца Жанчына - Афрадьтта. Рэфлексія на тэму кахання ва ўсіх яго абліччах... і пачуццёвым адзінстве, імкненні да «сёмага» і «дзевятага» паверхаў неба [9, с. 49],

У паэтычнай міфалогіі Хадановіча жанчыны маюць драматычны (часцей, трагікамічны) зямны лёс («толькі птушкі пакуль не было: яна, мабыць, зламала крыло...») І боскі адбітак на імені:

«Над табою бясхмарнае неба,
пад табою вільготная глеба;
ты не бачыла, як спакваля
пад табой высыхала зямля» [4, с. 43].

Паэт абвяшчае Жанчыну «...прыгожай, пяшчотнай, прывабнай і любай» [4, с. 41], Алёнкай «у сукеначцы вузкай» [4, с. 41], «Грэтхен, сястрой Мальгрэты», «belles-lettres», ведзьмай («не тэстуй сваё памяло») [4, с. 40]. Такія Яе знакавыя характарыстыкі хаваюць невыказаныя міфалагічныя, літаратурныя сюжэты, стрыжкем якіх з'яўляецца тэма кахання-палкасцІ - «сёння рызыкаваць цікава» [4, с. 41]. Непрыступная, далёкая (царыца Спарты) Алена і блізкая, тутэйшая - «цалуеш жабу» (Алена Прыкрасная) [12, с. 143]. Гётаўская Грэтхен і Ведзьмы на Лысай горы. Беларуская Алена з ручнікамі і Вялікія Прачкі. 1х яднае аўтарская прага авалодання жанчынай, «пазбавіць цноты» [4, с. 41], каб дасягнуць новага свету, новай сутнасці на«завісць багам».

Тэма Жанчыны ў паэзіі Хадановічазлітая з музычнаю тэмаю. Здаецца - тэта музыка сфер, адсюль і схільнасць да класІчнага вершаскладання, адсюль і музыка - як тэма. У кагосьці - надвор'е, у ХадановІча - стыхія музыкі; ад макабрычных скокаў, «Totentanza - белага танца, апошняга шанца!» [4, с. 41], да «Тэтралогіі Вагнера». Апошняя ўяўляе сабою завершаную музычную форму: ад уступу як размовы з

класікамі да прысуду сучаснасш̌ (асноўная публіцыстычная тэма) і далей аб нараджэнні свайго тэксту-кахання (лірычная тэма), сваёй с пробы знайсці Прыгажосць, ці лягушку-царэўну (адкрыты складаны тэматычна фінал). Сімфанізм Хадановіча абарочваецца казачна-міфалагічным колам існавання чалавека, ці пошукам сябе ў свеце.

Згаданыя вышэй думкі прыводзяць нас да высноў аб тым, што Андрэй Хадановіч Імкнецца не толькі пагуляць у сваіх творах са знаёмымі міфалагічнымI вобразамі ~ але I стварыць сваю міфалогію, напісаць новыя «свяшчэнныя» кнігі літаратуры - сучасныя «Талмуд» і «Пяцікніжжа», як і герой яго лімерыкаў:

Пачатковец-празаік з Нясвіжу
пенталогію склаў для прэстыжу.
Як назваць? «Пентагон»?
Можа, «Пентамерон»?
Перавагу аддаў «Пяцікніжжу» [13, с. 120).

- у здзеклівым лімерыку Хадановіча ёсць толіка сэнсу. Яго паэтычны зварот да міфалогіI - гэта пера-асэнсаванне сутнасці творчасці сёння, гэты споведзь пра ўніверсальны канфлІкт гісторыі - памІж паэтамі і светам. Хадановіч такім чынам стварае стэрэафанічнасць культуры, ён праепыруе яе на экран універсальных праблем, што зафіксаваны міфалогіяй.

ЛIТАРАТУРА

1. Хадановіч А. Пішу для адукавваных вар'ятаў / З А. Хадановічам гутарыць С. Курс *11* Arche. Пачатак. - 2002. - № 3 (23), - С. 37.
2. ХадановІч А. ...Сваёй задачаю лічу разбурэньне стэрэатыпаў.... / ЗА. Хадановічам гутарыць Г. Кісьліцына // Дзеяслоў. - 2003 - № 5. - С. 189.
3. Андруховіч Ю. Андрэй Хадановіч і перавагі акупацыйнага рэжыму. Рэцэнзія: Лйстй з-під ковдрй. - Киів. *11* Arche. Пачатак. - 2002. - № 3 (23), -С.7І.
4. Хадановіч А. Наследаванне Гарацыю // Крыніца - 1998. - № 10. - С. 42.
5. Панамароў В. Ліставаньне з клясыкамІ // Arche. Пачатак. - 2002.-№3 (23). - С. 73.
6. Хадановіч А. Калыханка для маладога літаратара // Arche. Пачатак. - 1999, - JVs 4, - С. 141.
7. Мифологический словарь / Гл. ред. Е.М. Мелетинский, - М.: Совр. энциклопедия, 1991. - С. 145,
8. Хадановіч А. Мэтапаэзія I какетлівы дзявочы суіцыд // Arche. Пачатак. - 2002. - № 3 (23). - С. 66.
9. Хадановіч А. Альбы і сырвэнты // Arche, Пачатак. - 2002. - № 3 (23). - С, 47.
10. Арлоў У. Мне прысьніўся Хадановіч *11* Arche. Пачатак. - 2002. - № 3 (23). - С. 60.
11. Міхееў К. Еўропа, разумеет?... // Arche. Пачатак. - 2002. - № 3 (23). - С. 55.
12. Хадановіч А. Вагнер. Тэтралогія «Фаўст» // Крыніца. - 2001. - № 1 (61). - С. 143.
13. Хадановіч А. Землякі, альбо Беларускія лімерыкі. -Мн.: Логвінаў, 2005. - 120 с.